№ 95 Сакавік

# НІКА



# Інтэрв'ю з Міхаілам Мальцавым

**-Калі б вы маглі паслаць паведамленне ўсяму свету, то якое?**
**-У такой сітуацыі, я б забяспечыў свету нядрэннае стэндап-шоў.**

***Сёння мы размаўляем з сур'ёзным і цікавым суразмоўцам, магістрантам Міхаілам Мальцавым. У інтэрв'ю вы даведаецеся, як кампутарныя гульні могуць паспрыяць на выбар будучай прафесіі, як мапы дапамагаюць у напісанні магістарскай працы, а таксама вы атрымаеце параду на будучыню.***



**Адно з традыцыйных пытанняў: як вы патрапілі на гістфак БДУ?**

Гісторыя мяне заўсёды цікавіла, асабліва інтарэс пайшоў з 8 гадоў, калі я пачаў гуляць у серыю кампутарных гульняў Age of Empires. Аднойчы, напрыканцы 11 класа, я апынуўся ў вельмі цяжкім становішчы, калі я не разумеў, што мне ў гэтым жыцці патрэбна, і вырашыў ісці вучыцца ў тую сферу, якая мне дакладна будзе цікава. Я абраў гістфак. Падкрэсліваю, што я ніколі аб гэтым не пашкадаваў.

**Ці плануеце навучацца ў аспірантуры?**

Безумоўна, для мяня гэта абавязковы этап адукацыі.

**Ці адчуваеце вы нейкія асаблівыя перамены ў параўнанні з тым часам? Ці змяніліся вы духоўна і псіхалагічна пасля таго, як сталі студэнтам?**

Так, канешне! Раней, адразу пасля паступлення на гістфак, я адчуваў сябе так, што я нічога не ведаю. Але зараз я шмат чаму навучыўся на гістфаку. Па-першае, я навучыўся вучыцца, таму што ў школах гэта была не вучоба, а нейкая незразумелая і сумная справа. Таксама я навучыўся вельмі добра казаць, вельмі добра пісаць, прыдаваць сваім думкам на паперы больш навуковы стыль. Канешне я вельмі змяніўся. Я атрымаў выдатныя веды, якія зараз вельмі дапамагаюць у маёй прафесійнай дзейнасці.

**Акрамя вывучэння гісторыі, чым вы яшчэ захапляецеся?**

Раней меў шмат розных хобі: лавіў рыбу, скакаў з парашутам. Але зараз, каб рацыянальна выкарыстоўваць час, грошы і сілы, я вырашыў мець два карысных хобі – гэта гатаванне розных прысмакаў ды рамонт і абслугоўванне аўтамабіля, праца з яго тэхнічнай часткай.

**Студэнцкія гады – адзін з яркіх момантаў у жыцці. А жыццё таксама складаецца і з успамінаў. А якія ўспаміны з часоў студэнцтва вы лічаце лепшымі?**

Наогул, студэнцва – гэта адзіны вялікі добры ўспамін. З цеплынёй памя-таю заняткі нашых добрых выкладчыкаў, падрыхтоўку розных навуковых прац, а таксама падарожжы з маімі гістфакаўскімі сябрамі. Асабліва шчаслівы і вольны, і прыемны быў перыяд да пандэміі.

**Я ведаю, што вы вядзеце актыўнае студэнцкае жыццё і былі сакратаром Студэнцкага саюза па якасці адукацыі. На ваш погляд, якую ролю выконваюць студэнцкія арганізацыі ў жыцці студэнтаў? Што асабіста вам даў удзел у студэнцкіх арганізацыях і канешне ж у Студэнцкім саюзе па якасці адукацыі і навуке?**

Найперш, студэнцкія арганізацыі ар-

ганізуюць розную дапамогу студэнтам, а, па-другое, даюць магчымасць рэалізаваць сябе ў розных накірунках. ССЯАН мае функцыі больш адукацыйныя ды навуковыя, таму, зыходзячы з гэтага, мае практычны і карысны вынік дзейнасці. ССЯАН дапамог мне праявіць сябе як кансультанта ў розных справах.

**Зусім нядаўна я вас сустрэла ў архіве, дзе вы разглядалі вялізныя мапы. Калі не сакрэт, то якія ў вас навуковыя інтарэсы? Ці былі тыя мапы карысны?**

Я займаюся падрыхтоўкай магістарскай працы па тэме «Мінск у перыяд германскай акупацыі: вопыт вывучэння картаграфічных матэрыялаў». Тэма адлюстроўвае мае навуковыя інтарэсы – картаграфічнае крыніцазнаўства. Дакладна карты з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь вельмі карысныя для маёй працы.

**Калі б вы маглі стаць сведкам любой падзеі з мінулага, сучаснасці ці будучыні, што б вы абралі?**

Добра б было, каб я апынуўся ў сённяшнім дне, але без пандэміі, войн і шматлікіх сацыяльных супярэчнасцяў.

**Калі б вы маглі запрасіць на абед любога дзеяча гісторыі, каго б вы выбралі і чаму?**

У розныя перыяды ў мяне ўзнікала жаданне сустрэцца з рознымі цікавымі асобамі, але няхай гэта будзе Лі Куан Ю. Менавіта ён, бо ў свой час ён здолеў зрабіць з маленькай выспы, нават без чыстай вады, ва ўмовах залежнасці ад розных фактараў найбольш усебакова развітую краіну.

**Што змянілася на гістфаку з моманту вашага паступлення?**

Самыя вялікія змены – гэта тыя змены, якім паспрыяла пандэмія. Па-першае, з'явіліся разнастайныя формы навучання, у першую чаргу стала больш дыстанцыйнага навучання і практыкі. Выкладчыкі сталі больш шырока выкарыстоўваць эўрыстычныя метады працы са студэнтамі, дзякуючы нашаму рэктару А. Д. Каралю. Крыху змяніўся прафесарска-выкладчыцкі склад на факультэце.

**Міхаіл, вы ўжо магістрант. Калі ласка, дайце параду для нашых студэнтаў.**

Выкарыстоўвайце свой час па максімуме, перманентна вучыцеся чамусьці новаму, хадзіце на пары і паважайце выкладчыкаў.

**Здольнасць, якой вам хацелася б валодаць?**

Я не хачу сказаць, што ў мяне з гэтым дрэнна, але я б хацеў, каб у мяне была больш добрая памяць, каб я мог памятаць практычна ўсё, што прачытаў і тое, што ўбачыў. І ,канешне, здольнасць да больш лёгкага вывучэння замежных моў.



**Бліц-апытанне:**

**Лепшае месца ў свеце?**

Там, дзе нас няма, але вельмі туды хочацца.

**Кніга, якую павінен прачытаць кожны ?**

На жаль, няма кнігі, якая адкажа кожнаму на пытанні яго жыцця і дзейнасці. Для кагосьці – гэта Біблія, для кагосьці – Канстытуцыя, для, трэціх можа быць, нават, вайсковы статут. Трэба разумець, што гэта залежыць ад ладу жыцця або сферы дзейнасці. Але ўсім раю чытаць, чытаць многа і найперш кнігі, якія проста цікавяць і натхняюць. Больш таго, для мяне найбольш каштоўнымі з'яўляюцца тыя кнігі, у якіх простай мовай і словамі апісваюцца складаныя для разумення працэсы і з'явы.

*Аўтар: Аляксандра Мядзведзева.*

# Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі: дзейнасць, змены, перспектывы

Студэнцкае самакіраванне – неад'емная частка студэнцкага жыцця і жыцця ўніверсітэта. На гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта самакіраванне рэалізуецца праз дзейнасць студэнцкіх арганізацый. Адной з такіх з'яўляецца Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі.

Задачы і магчымасці гэтай арганізацыі даволі шырокія і living рознабаковыя. ССЯАН займаецца праблемамі якасці адукацыі, паляпшэннем даследчых навыкаў студэнтаў, праводзіць як навуковыя, так і рэкрэацыйныя мерапрыемствы і гэтак далей. Члены Студэнцкага савета па якасці адукацыі і навукі могуць раскрыць і палепшыць свае здольнасці ў любых сферах жыцця факультэта, якія іх цікавяць.

Дадзены артыкул раскажа чытачам аб дзейнасці Студэнцкага савета па якасці адукацыі і навукі на гістарычным факультэце БДУ ў лютым і сакавіку 2022 года.

Люты пачаўся бадзёра. Адышоўшы ад зімовай сесіі і канікул, 4 лютага прайшоў сход ССЯАН, на якім прысутнічалі старшыня ССЯАН БДУ Аліна Рэцькова і яе намесніца Аляксандра Пірштук. Дзяўчаты пазнаёміліся са складам Савета гістарычнага факультэта, выслухалі пытанні і прапановы сяброў арганізацыі. Склад ССЯАН падвёў вынікі за мінулы год, абраў намесніка старшыні (Артамонаў Павел) і сакратара (Макееў Ілля), а таксама распрацаваў план бліжэйшых мерапрыемстваў.

Далей Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі правёў тэматычнае мерапрыемства да дня Святога Валянціна. Каманда першакласных дызайнераў распрацавала канцэпт віншавальных паштовак. У выніку была арганізавана «Пошта Валянціна». Студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта БДУ змаглі адправіць сябрам пасланне, а 15 лютага супрацоўнікі ССЯАН даставілі ўсю пошту сваім адрасатам.

Да Дня роднай мовы Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі арганізаваў лекцыю на тэму: «Мова і нацыянальная ідэнтычнасць». Лектарамі сталі дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Сосна Уладзімір Аркадзьевіч, а таксама студэнт філалагічнага факультэта Лявонцьеў Глеб. Галоўнай праблемай лекцыі было развіццё беларускай мовы і змены яе месца ў гісторыі нашай краіны. Таксама лектары адказалі на разнастайныя пытанні, у тым ліку пра выкарыстанне класічнага правапісу і «наркамаўкі».



Вясна – час перамен и дзейнасць ССЯАН адпавядае гэтаму часу года: Савет па якасьці адукацыіператвараўся ў Савет па якасці адукацыі і навукі. Мэта дзейнасці ССЯАН – садзейнічанне паляпшэнню якасці адукацыі ў БДУ і на факультэце, рэалізацыя правоў студэнтаў па прыняцці рашэнняў у сферы адукацыйнай палітыкі ўніверсітэта, а акрамя: актывізацыя навуковага патэнцыялу і стварэнне ўмоў для развіцця навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў і магістрантаў БДУ, інтэграцыя іх у навукова-адукацыйную прастору.

3 сакавіка у межах глабальнага ўніверсітэцкага праекта «Студэнт па абмену», арганізаваны ССКОН БДУ, гістарычны факультэт прымаў калег з розных факультэтаў БДУ. У дадзеным праекце паўдзельнічалі Факультэт філасофіі і сацыяльных навук, Юрыдычны факультэт, Гістарычны факультэт, Эканамічны факультэт і Факультэт сацыякультурных камунікацый. Студэнты іншых факультэтаў правялі цэлы дзень на нашым, наведвалі лекцыі па гісторыі рэлігій, этналогіі і этнаграфіі Беларусі, дакументазнаўстве і г.д. Таксама была праведзена экскурсія ў музей гістарыч-

нага факультэта, а пасля студэнты за гарбатай з печывам даведаліся пра жыццё і дзейнасць гістфаку ад супрацоўнікаў ССКОН і намесніка дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Верамейчык Аліны Яўгенаўны.

4 сакавіка 2022 г. на гістарычным факультэце БДУ ССКОН правёў ананімнае анкетаванне сярод студэнтаў спецыяльнасці «Рэгіёназнаўства». Анкетаванне накіравана на вывучэнне праблем і актуальнасці курса «Асновы матэматычнай статыстыкі». Прапаноўвалася адказаць на 5 пытанняў. Колькасць рэспандэнтаў, якія здалі анкеты – 20, гэта ўся навучальная група. Дадзенае даследаванне было праведзена Камісіяй кантролю якасці адукацыі ССЯАН гістарычнага факультэта. Вашай увазе прадстаўляем высновы:
-большасць рэспандэнтаў адчуваюць цяжкасці пры вывучэнні курса, тым не менш, гэта не перашкаджае засваенню курса.
-абсалютная большасць задаволена якасцю выкладання курса.
-пры ўзнікненні складанасцей рэспандэнты звяртаюцца да інтэрнэта, выкладчыка і аднагрупнікаў.
- на думку большасці, курс дае карысныя веды па спецыяльнасці «Рэгіёназнаўства».
-большая частка апытаных лічыць, што колькасць навучальных гадзін на дадзены момант дастатковая.

У графе «Заўвагі і прапановы», 2 рэспандэнты выказалі жаданне працаваць далей з выкладчыкамі, 1 рэспандэнт прапанаваў выключыць вывучэнне матэматычных дысцыплін на спецыяльнасці «Рэгіёназнаўства», 1 рэспандэнт прапанаваў аптымізаваць курс, пакінуўшы самае асноўнае, 1 рэспандэнт прапанаваў пашырыць курс, дадаўшы ў яго вышэйшую алгебру і дыферэнцыяванне.

По вашему мнению, курс «Основы математической статистики» необходим для специальности «Регионоведение»?




Вызывал ли у вас трудности курс «Основы математической статистики» ?




Да дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства Каўн Сяргей Барысавіч правёў лекцыю для студэнтаў на тэму: «Гісторыя Канстытуцыі на беларускіх землях». Сіламі ССЯАН быў створаны тэматычны стэнд з Канстытуцыямі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі падчас розных эпох, а таксама не абыйшлося і без іншых прававых дакументаў. Гэты матэрыял атрымалася сабраць дзякуючы кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, а гэтаксама Фундаментальнай бібліятэцы БДУ. Легендарная гістарычная падзея адбылася 11 сакавіка. На сходзе Студэнцкага савета па якасці адукацыі і навукі была праведзена рэформа камісій і канчаткова падрыхтаваны план наступных мерапрыемстваў. У выніку рэформы былі створаны: камісія Кантролю якасці адукацыі (кіраўнік – Кухарэнка Арцём), Арганізацыйная камісія (кіраўнік – Даўматовіч Кірыл), Інфармацыйная камісія (кіраўнік – Галавацкая Дар'я). Таксама быў пацверджаны структурны статус газеты «Ніка» як аўтаномнага праекта ССЯАН гістарычнага факультэта.

Вось такая насычаная дзейнасць у арганізацыі. Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі клапоціцца аб студэнтах гістарычнага факультэта БДУ і працуе для агульнага дабра! Склад ССЯАН заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу студэнцтву і адкрыты для супрацоўніцтва. Новыя змены спрыяюць паляпшэнню працы арганізацыі. Сачыце за нашымі сацыяльнымі сеткамі, не прапусціце новыя мерапрыемствы і цікавы кантэнт. Дзякуем усім, хто чакае і любіць нашы мерапрыемствы, дзякуем чытачам, якія з нецярпеннем чакаюць кожнага новага выпуску газеты «Ніка»!

*Аўтар: Макееў Ілля.*

# Кітай важна разумець...




Любы чалавек, які хоць раз хадзіў па крамах або вандраваў па прасторах інтэрнэту, не мог не заўважыць такую з’яву, як выдатная ў сваёй разнастайнасці і вельмі ўжо самабытная культура Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яна шмат каму ўяўляецца як нешта далёкае, абсалютна недасяжнае, да чаго нельга будзе ніколі дакрануцца, глядзець хіба што кітайскія фільмы ды спрабаваць пранікнуцца культурай гэтага незвычайнага, трохі таямнічага народу праз экраны. Аднак нядаўна ў студэнтаў нашага факультэта з’явілася ўнікальная магчымасць пазнаёміцца не толькі праз экраны, але і ў жывую патрапіць у кітайскае асяроддзе. Гэтую магчымасць падарыла штогадовае правядзенне «Школы маладога кітаязнаўца» ў Рэспубліканскім інстытуце кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ. Мерапрыемства прайшло 11 сакавіка.

«Школа маладога кітаязнаўца» – унікальная з’ява, якая дазволіла не толькі пагрузіцца ў атмасферу сяброўскага ўзаемадзеяння, але яшчэ і выступаць з уласнымі дакладамі, даведацца думкі іншых удзельнікаў. Гэта мерапрыемства было арганізавана ў вочна-дыстанцыйным фармаце. Выступілі з дакладамі не толькі студэнты, аспіранты і магістранты, але гэтак жа Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяоюн, генеральны дырэктар кампаніі па развіцці індустрыяльнага парку «Вялікі камень» Лі Чжунхань, дырэктар РІКК Анатоль Тозік, намеснік начальніка кіравання інфраструктуры развіцця, начальнік сектара эканамічных зонаў Міністэрства эканоміцы Вольга Малая і інш. Варта адзначыць выдатную працу сінхронных перакладчыкаў, якая дазволіла не губляць разумення агульнай сутнасці дакладаў.

Мерапрыемства прысвечана да трыццацігоддзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін Рэспублікі Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікі. Структурна «Школа маладога кітаязнаўца» была падзелена на чатыры тэматычныя секцыі, у якіх закраналіся пытанні развіцця супрацоўніцтва Кітая і Беларусі, эканамічнага і сацыяльнага развіцця сучаснага Кітая. Па выніках працы плануецца выпуск зборніка навуковых артыкулаў.

Прайшла «Школа маладога кітаязнаўца» на сапраўды высокім узроўні, таму некаторыя яе ўдзельнікі захацелі падзяліцца з нашай газетай сваімі ўражаннямі:

### *Максім Маеўскі:*

**Чым цябе зацікавіла «Школа маладога кітаязнаўца»?**

У першую чаргу, ШМК мяне прывабіла тым, што гэта ўнікальная магчымасць пазнаёміцца з Кітаем бліжэй, даведацца аб нашых з ім адносінах і дакрануцца да іх унікальнай і непаўторнай культуры.

**У якой ролі ты прысутнічаў на мерапрыемстве?**

Я прысутнічаў там у якасці навуковага супрацоўніка, які прадставіў свой артыкул: «Аб усталяванні беларуска-кітайскіх адносінаў».

**Чым «Школа» табе запомнілася?**

«Школа маладога кітаязнаўца» – гэта месца, дзе збіраюцца людзі, якія па-сапраўднаму цікавяцца тэмай Кітая і яго адносінаў з Беларуссю. Гэтаксама ШМК запомнілася выступамі афіцыйных асоб не толькі з Беларусі, але і з Кітая, у прыватнасці пасла КНР у Беларусі Се Сяоюня, які выказаў пазіцыю Кітая ў дачыненні да ўласнай унутранай палітыкі і палітыкі адносінаў з астатнім сусветам. Таксама былі зачытаны рашэнні 6-га пленума ЦК Камуністычнай партыі Кітая 11 склікання і прыведзены цытаты старшыні Сі Цзіньпіна. Тым самым была высветлена пазіцыя партыі.

**Якія, на твой погляд, важныя тэмы падымаліся падчас абмеркавання?**

У прынцыпе, усе тэмы, што ўздымаліся па ходзе абмеркавання, я лічу вельмі важнымі, асабліва ўлічваючы сітуацыю, якая склалася на дадзены час. Але найбольш важнымі можна лічыць праблемы і перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва і ўнутраную палітыку Кітая, бо Кітай зараз з'яўляецца адным з самых буйных удзельнікаў сусветнай палітыкі, і Беларусі варта ўлічваць дасягненні гэтай дзяржавы, у адпаведнасці з імі будаваць сваю палітыку ў сферы міжнародных адносін.

**Ці рэкамендуеш ты іншым наведванне «Школы маладога кітаязнаўца»?**

«Школа маладога кітаязнаўца» – гэта ўнікальны шанец атрымаць вопыт узаемадзеяння з афіцыйнымі прадстаўнікамі вельмі далёкага і гэтаксама ўнікальнага і незвычайнага Кітая. Я лічу, што такі шанец не варта страчваць, бо за Кітаем будучыня і, зразумеўшы яго як мага раней, можна стаць вельмі запатрабаваным спецыялістам.



***Шурпо Дар'я:***

**Чым цябе зацікавіла «Школа маладога кітаязнаўца»?**

«Школа маладога кітаязнаўца» прыцягвае ў першую чаргу сваёй маштабнасцю. Яна дазваляе маладым людзям, будучым і цяперашнім навукоўцам праявіць сябе ў аналітыцы, дапамагчы развіць той кірунак, што яны любяць – гэтым гурт прыцягвае больш за ўсё. Вядома, тут нельга таксама не ўзгадаць асаблівы каларыт, які, без сумнення, прысутнічаў і на які цікава было паглядзець нават мне, чалавеку не самаму зацікаўленаму ў Кітаі і кітайскай культуры.

**У якой ролі ты прысутнічала на мерапрыемстве?**

На мерапрыемстве я прысутнічала ў якасці звычайнага назіральніка і журналіста газеты «Nika» гістарычнага факультэта БДУ.

**Чым «Школа» табе запомнілася?**

Канешне, сваёй шматграннасцю! Для чалавека як я, які ні разу дагэтуль не прымаў удзелу ў зручным мерапрыемстве, асабліва запомнілася шматмоўе – падчас дакладаў і абмеркаванняў выкарыстоўваліся як руская ці беларуская, так кітайская і англійская мовы. Вельмі незвычайна было чуць такую культурную сумесь. Да таго ж прыемнае афармленне і магчымасць пазнаёміцца з прадстаўнікамі культуры, мабыць, гэта было сапраўды цудоўна і вельмі-вельмі натхняльна.

**Якія, на твой погляд, важныя тэмы падымаліся падчас абмеркавання?**

О, у ходзе «Школы» падымалася досыць вялікая колькасць пытанняў, такіх як сацыяльна-эканамічнае і іншыя ўзаемадзеянні Кітая і Беларусі, выпрацоўка агульнага напрамку і палітыкі ўзаемадзеяння, узаемадапамога ва ўмовах пандэміі Covid-19 і падобныя сур'ёзныя тэмы, абмеркаванне якіх у сучасных рэаліях сапраўды неабходна.

Хочацца да таго ж выказаць надзею на тое, што мы і ў будучыні зможам назіраць за развіццём «Школы маладога кітаязнаўца» як мерапрыемства, якое збірае ў сваіх рамках людзей, аб'яднаных вывучэннем Кітая ва ўсіх яго аспектах: сацыяльным, эканамічным і культурным.

*Аўтар: Шурпо Дар'я*
*Фатограф: Шурпо Дар'я*

# Калі не сядзіцца ў Мінску: пра выязную навуковую канферэнцыю ў сталіцы Палесся

Навука - адна са складаючых частак навучання на факультэце. На працягу трох курсаў мы пішам даследаванні ў рамках курсавых прац. На парозе выпуску - дыпломную працу. А нехта і далей працягвае спасцігаць акадэмічны Алімп. Аднак усё пачынаецца з малога. З першага выступу на канферэнцыі, з першай публікацыі. Дарэчы, удзел у канферэнцыях можа даць не толькі маральнае задавальненне ад усведамлення ўкладу ў нацыянальную і міжнародную навуку, але і матэрыяльнае: наяўнасць публікацый у зборніках канферэнцый дае права падацца на імянную стыпендыю (напрыклад, Янкі Купалы), а яна, між іншым, у два разы больш за звычайную!

Пра свае ўражанні ад удзелу ў канферэнцыі «Сацыяльныя, палітычныя і культурныя працэсы на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў гістарычнай перспектыве» (25-26 лютага 2022, Пінск) пішуць старшыня ССЯАН Гістарычнага факультэта БДУ Данііл Пясецкі і старшыня арганізацыйнай камісіі ССЯАН факультэта Кірыл Даўматовіч.

### *Данііл Пясецкі:*

Усё пачалося з таго, што за дзень да ад’езду на канферэнцыю ў Пінск мяне насцігла пачуццё гістарычнага рэвізіянізму і не хацеў больш нікуды ехаць. Аднак трэба аддаць належнае, усё, што ні робіцца, то да лепшага. У Пінск мы прыехалі на цягніку а 5 гадзіне раніцы. У нас была безліч часу, каб агледзець цудоўную сталіцу Палесся, якая ноччу выглядае па-асабліваму. Выйшаўшы ў гістарычны цэнтр Пінска, мы шукалі, дзе ж знаходзіцца знакаміты калегіум і францысканскі манастыр. Наша падарожжа па гэтым цудоўным горадзе толькі пачыналася, наперадзе нас чакла цікавая канферэнцыя ў Палескім дзяржаўным універсітэце, знаёмства з класнымі гісторыкамі-даследчыкамі, а таксама абмеркаванне тэм нашых артыкулаў і навуковых інтарэсаў. Натуральна, самая цікавая частка канферэнцый – нефармальная, якая працягнулася і на наступны дзень займальнай экскурсіяй ад арганізатараў.

Пінск - горад унікальны. Калі ідзеш па ім, прама адчуваеш характэрныя для Заходняй Беларусі рысы ў архітэктурнай спадчыне. Абмяркоўваючы з калегамі, да якога менавіта перыяду адносіцца той ці іншы будынак, разумееш, што нездарма ў свой час вывучаў архітэктурныя стылі розных эпох. Такім чынам, мы на практыцы замацоўвалі наяўныя веды. Канферэнцыя і сам горад пакінулі самыя прыемныя ўражанні. Вельмі хочацца вярнуцца ў гэтае цудоўнае месца.

Пясецкий Д. Проблема титула «supremus dux lithianiae» в истории Великого княжества Литовского до 1413 г. / Д. Пясецкий // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей, УО Полесский государственный университет“, Пинск 25 февраля 2022 г. / Министерство образования Республики Беларусь [и др.]; редкол.: В.И. Дунай [и др.]. –Пинск : ПолесГУ, 2022. – Вып. 7. – С. 147-150.



### *Кірыл Даўматовіч:*

Яшчэ ў 2020 годзе мы ведалі аб тым, што ёсць магчымасць апублікаваць свае навуковыя напрацоўкі ў Палескім дзяржаўным універсітэце. Нават планавалі ехаць у Пінск, але эпідэмія COVID-19 не дазволіла правесці навуковае мерапрыемства ў звыклым фармаце. Удзельнічалі завочна.

У 2021 годзе я перыядычна маніторыў навуковыя мерапрыемствы. Разумеў, што ў сталіцы Палесся мусіць нешта рыхтавацца. Але іншыя канферэнцыі, вучоба, праца ў школе адцягвалі ўвагу. Ужо напачатку гэта-

га семестра раптоўна выявіўся доўгачаканы інфармацыйны ліст. Тэрміны падціскалі... Аднак быў ужо напрацаваны матэрыял на аснове якога рыхтуецца курсавая праца. Падрэдагаваў. Адправіў у аргкамітэт.

Надышоў дзень паездкі. Пасля заняткаў мы пайшлі збірацца на начны цягнік. Выезд а 23 гадзіны ночы. Шлях 6 гадзін. Прыехалі.

Горад уразіў. Захавалася шмат архітэктуры розных эпох: ад сярэднявечнага гарадзішча да адміністрацыйных будынкаў Расійскай імперыі. Гэта дзівіць!

Надышоў час канферэнцыі. Выступалі розныя людзі: ад студэнтаў да дасведчаных вучоных. Дадзенае мерапрыемства дало магчымасць падзяліцца з шырэйшым кругам асоб сваімі напрацоўкамі і думкамі не толькі на «навуковай арэне», у адной з аўдыторый, але і за яе межамі. Па выніку паездка пакінула шмат станоўчых эмоцый і ўспамінаў.

Довматович К. Правотворчество сейма Великого княжества Литовского: от Сигизмунда Старого к Сигизмунду Августу / К. Довматович // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей, УО Полесский государственный университет", Пинск 25 февраля 2022 г. / Министерство образования Республики Беларусь [и др.]; редкол.: В.И. Дунай [и др.]. –Пинск : ПолесГУ, 2022. – С. 167-170



Вельмі спадзяемся, што гэты артыкул натхніць вас на ўдзел у навуковых канферэнцыях! Калі вам сапраўды цікава займацца акадэмічнай працай - ні ў якім разе не лянуйцеся! Як казалі вышэй - усё пачынаецца з малога. Спачатку гэта проста артыкул у невялічкім кафедральным зборніку, а там ужо і да дысертацыі не вельмі далёка. Калі вы сумняецеся, то варта прынамсі паспрабаваць. Калі не спадабаецца, тады вы сапраўды зразумееце, што гэта не ваша. Спадабаецца - яшчэ лепш! Арганізатары любых навуковых мерапрыемстваў заўсёды рады любым удзельнікам, любым цікавым тэмам і нестандартным падыходам да тэм ужо вывучаных. Больш за тое, вам дакладна не паставяць дрэнную адзнаку ў рэйтынг, дык чаму б і не? Per aspera ad astra!



*Аўтары: Данііл Пясецкі, Кірыл Даўматовіч*
*Фота: Данііл Пясецкі, Марыя Радюк*

**«Паэзія - выява глыбокай і найбольш таямнічай дзейнасці чалавечага пачуцця»**
**Д. Міль**

Сярод чытачоў «Нікі», студэнтаў гістарычнага факультэта, многія праявілі цікавасць да публікацыі ўласных вершаў на яе старонках. Многія знакамітыя нам паэты-класікі калісьці пачыналі свой творчы шлях на развbabаротах часопісаў: ананімна ці не, яны імкнуліся данесці Свету свае думкі і пачуцці ў недаступных прозе словах, як і сёння нашы студэнты, дасылаючы свае творы ў «Нікі».

### Непрочтённое письмо

*Я нет, не печалюсь*
*Время печали давно позади.*
*Но я не забыла…*
*Время забвенья ещё впереди…*

*Июльские грозы смоют все чувства,*
*Заменят их новыми, уже не к тебе.*
*Мой друг, не печалься, ТЕБЯ не забуду,*
*Осенние листья оставлю себе.*

*Держи меня крепко.*
*Держи, не теряй.*
*Целуй не касаясь,*
*Душу прочитай.*
*Не думай, не мучься,*
*Не бойся, не бей.*
*Снаружи же холодно,*
*Внутри здесь теплей…*

*Я хочу утопить эти мысли.*
*С тобой постою на краю.*
*Ты захочешь пойти со мной в самые дали…*
*Губы не сдержат простое «люблю»…*

**Аўтар пажадаў застацца ананімным**

### Рулетка любви

*Всегда, когда смотрю я на тебя,*
*Куда-то пропадает мой контроль,*
*Хочу прикоснуться нежно и любя*
*К твоим губам, как будто это алкоголь...*

*Ты терзаешь своей красотой,*
*Моё тело, мою невинную душу,*
*И после, почти что не живой,*
*Во тьме я сердце твоё обнаружу.*

*Как ты любишь издеваться надо мной,*
*Я чуть ли не на мели...*
*Но знаешь, что понял про нас с тобой?*
*Детка, мы играем в рулетку любви...*

**Арсений Радюк**

***

*Деревья будто пламенем сгорают*
*И на обрывках паутины*
*Я всё сильнее ощущаю*
*Осколки пасмурной рутины*

*Калитки ржавой скрип тоскливый*
*И света луч ушёл за горизонт*
*Мой взгляд осенний, взгляд наивный*
*Холодный пронизает фронт*

*Темнее с каждым новым часом*
*Всё реже стали сниться сны*
*Зовёт меня туманным гласом*
*Конец надуманной весны*

*Реки загадочной мотивы*
*И ветра оглушительный порыв*
*На старый сад прекрасны перспективы*
*Но смотрит на меня пора полей седых*

*Откликнулся клин журавлиный*
*Печальную песнь начинает*
*Пролог бывает слишком длинный*
*Но эпилог все завершает*

*Сумрак покажет как сном упиваться*
*А тёмная ночь как кричать*
*Но мысли летальные вновь повторятся*
*Меня заставляя писать*

**Данііл Грыбаў**

## Плач историка

*А мы?*
*А мы кто такие?*
*Не первопечатники, не философы.*
*Мы современники, старых времен отголоски, агностики.*
*А кто же мы всё-таки?*
*Роли лишенные? Романтики и поклонники?*

*Есть роль нам, иль так и будем на руинах былого сидеть, наслаждаться своей субъективностью, знанием?*
*Знанием ложным, скупым,*
*его обаянием?*

*Жестоко, а что нам оправдываться?*
*Я жалуюсь, да, но не лучше ль покаяться?*

*И начать все сначала.*

*С греха первородного, с адамовой плоти начать,*
*с его сотворения?*
*в ту тишину кануть,*
*в нами нетронутую, что когда-то звучала.*
*Кто бы мы ни были,*
*не лучше ль начать все сначала?*

*Не лучше ли просто*
*Вернуться назад,*
*Почувствовать остро самим все искушения?*
*Смуте придаться, остановить наше тление.*
*Искупим все заново, все сотворим, все разрушим.*

*Не будет ли лучше?...*

*Неужто теперь остается лишь знать, как все было,*
*только догадываться?*
*Нет-нет! Нам не стоит оправдываться,*
*нам бы просто начать все сначала, к истокам отправиться...*

*Мы ведь уже столько проделали.*
*Сплетали, спускали, кричали, стонали, питали,*
*испытывали и угнетали,*
*и страстно стремились, желали, боялись, кривили губами,*
*слезы соленые пили,*
*мы убивали, живили, страдали, хотели, мы умирали.*

*Наскучило, стары мы стали.*
*Истерлась история, потрепалась.*
*И краюшка нам на странице ее не осталось.*

*А если сначала ее написать, скупыми чернильными строками. Отправить вперед, сквозь века,*
*что бы они, нам далекие, снова кричали, срывая все лёгкие:*
*«Да кто мы такие!?»*

**Историки**

## Лицемер. Оправдание

*Оправдание.*

*Хвост поджав, ты бежишь извиняться,*
*сердце рукой прикрывая актёрское.*
*Страшно признанть - неравнодушному, предъявленное броское*
*несправедливое себе обвинение.*
*Показушно на голове рвешь ты волосы -*
*лысиной хочешь заслужить одобрения.*

*Не хочешь, боишься ты осуждения.*
*Праведника из себя строишь,*
*пока твои мысли страха полны очевидного.*
*А на деле же корчишь*
*из себя непокорного.*
*Душу рвешь за идею ты якобы*
*и бросаешься в проповедь ярую,*
*мнения, суть, - бутафорного.*

*Прекрати,*
*если говоришь - делай,*
*за идеей чужой не гонись.*
*Или просто, коль робок,*
*боишься действительно,*
*не используй чужих почестей.*

*Не срамись*
*ты испуга, незнания,*
*не срамись страха зябкого, грусти, страдания.*
*И пиявкой не липни повсюду*
*одобрения в сердце чужом,*
*кровопийцей желая испить,*
*- ты его не получишь, признайся,*
*как не смогут на слове простить...*

**Аўтар пажадаў застацца ананімным**

# Некалькі слоў да міжнароднага дня гісторыка

Дваццаць восьмага сакавіка, калі нехта з вас не ведаў, прынята адзначаць як прафесійнае свята працоўнікаў такой гуманітарнай плыні, як гісторыя. Да гэтага ёсць нейкае жаданне абмеркаваць тое, а на што нам увогуле тая гістарычная навука? Нашто нам гэтае корпанне ў справах даўно мінулых часоў, што і дзеля чаго мы шукаем там?

Як некалі пісаў у сваёй працы “Метады даследавання гісторыі” брытанскі навукоўца Эдуард Фрыман: “Гісторыя – гэта палітыка дзён мінулага, а палітыка – гэта гісторыя дзён сучасных”. Зануpаючыся ў гісторыю, у нашае мінулае, мы насамрэч заўсёды шукаем у гэтай дрыгве не тое, што даўным-даўно там загінула, а тое, што яшчэ жыве сёння. Перш за ўсё мы шукаем там сябе і тое, што непакоіць нас зараз, на гэты самы момант. У цяжкія часы мы шукаем там нейкі ідэал, на які б мы маглі абаперціся. Чалавецтва за ўвесь час свайго існавання натварыла безліч памылак, безліч памылак яно творыць і сёння. Гісторыя дапамагае нам пабачыць гэтыя памылкі і паразважаць на тэму таго, як тых ці іншых сітуацый можна было б пазбегнуць, што трэба было рабіць дзеля таго, каб выйшла лепей. Не ведаючы таго, што было зроблена да нас, цалкам немагчыма зразумець што ды як нам рабіць далей. Таксама гісторыя неабходна дзеля разумення глабальнай сутнасці свету цалкам, дзеля разумення таго, хто мы ёсць і дзеля чаго існуем на гэтай зямлі. Таму гісторыя як паветра неабходна ўсім: ад звычайнага грамадзяніна да вышэйшых эшалонаў чыноўніцтва.

Аднойчы Чэрчыль казаў так: “Галоўны ўрок гісторыі заключаецца ў тым, што чалавецтва не навучальна”. Ці меў рацыю ў гэтым выказванні спадар Чэрчыль? Дык вось пакуль кожны не будзе ведаць гісторыю, мы раз за разам будзем асуджаны на яе паўтор у такой колькасці, пакуль не надыдзе час сыходзіць на канцавой.

Не мае ніякага значэння, дзеля чаго вы на гістарычным факультэце: ці вы студэнт, які жадае прысвяціць сябе навуковым даследаванням альбо выкладанню гісторыі наступным пакаленням, ці вы ўжо выкладчык, ці гісторыя патрэбна вам у некаторых іншых мэтах. Заўсёды памятайце адзіную рэч – дзеля чаго ж нам усім насамрэч патрэбна гісторыя.

***Усіх датычных – з прафесійным святам.***
***Галоўны рэдактар газеты “Ніка”, Артамонаў П.Б.***

**NIKA**

**Адрас рэдакцыі:**
**г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.**
**Тэл. +375336757095**
**E-mail: histgazetanika@mail.ru**
**Web:http://www.hist.bsu.by/studentam/sovet-po-kachestvuobrazovaniya/gazeta-qnikaq.html**
**Суполка «УКантакце»**
https://vk.com/public_nika

**Галоўны рэдактар:**
**Павел Артамонаў**
**Намеснік галоўнага рэдактара:**
**Ілля Макееў**
**Вёрстка:**
**Малькевіч Ангеліна**
**Карэктары:**
**Сяргей Крачкоўскі**
**Аляксандра Мядзведзева, Ксенія Рогач, Лізавета Семашчук**
**Заснавальнік:**
**Студэнцкі савет па якасці адукацыі і навукі гістарычнага факультэта БДУ**

**Распаўсюджваецца на правах унатранага карыстання (бясплатна)**
**Тыраж: 70 асобнікаў**

**Меркаванні аўтараў могуць не супадаць с пазіцыяй рэдактараў**

**VK** **Instagram**